**МАЗЫРСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

пл Леніна, 16, 247760, г. Мазыр
тэл: 8(0236) 300-111, факс 300-110

разлiковы рахунак 3604400160072, УНП 400036117
фiлiял № 317 ААБ “Беларусбанк” г. Мазыра

**МОЗЫРСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

пл. Ленина, 16, 247760 г. Мозырь
тел. 8(0236) 300-111, факс 300-110

расчетный счет 3604400160072, УНП 400036117
филиал № 317 АСБ “Беларусбанк” г. Мозыря

16.11.2022 № В-532зп/кач/1510
На №________ от__________

(для інфармавання іншых)

Мазырскі раённы выканаўчы камітэт на Ваш зварот аб стане бамбасховішчаў г. Мазыра інфармуе наступнае.

Згодна норм будаўніцтва 2.02.04-2020 «Інжынерна-тэхнічныя мерапрыемствы грамадзянскай абароны» абарона насельніцтва плануецца і ажыццяўляецца дыферэнцыравана, у залежнасці ад ваенна-эканамічных і прыродных характарыстык раёнаў, відаў і ступені небяспекі магчымых паражаючых фактараў у умовах вядзення ваенных дзеянняў, а таксама магчымых надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару.

Аднымі з асноўных спосабаў аховы насельніцтва з'яўляюцца выкарыстанне сродкаў калектыўнай абароны, часовае адсяленне ў бяспечны раён.

У адпаведнасці з арганізацыйна-плануючымі дакументамі абарона насельніцтва горада будзе ажыццяўляцца ў ахоўных збудаваннях грамадзянскай абароны, збудаваннях двайнога прызначэння, заглыбленых (напаўзаглыбленых) збудаваннях рознага прызначэння, сутарэнных памяшканнях, а таксама шляхам часовага адсялення ў бяспечны раён.

Прымаючы да ўвагі, што абагульненыя звесткі аб наяўнасці і месцах размяшчэння ахоўных збудаванняў грамадзянскай абароны з'яўляюцца інфармацыяй абмежаванага доступу, яе прадастаўленне немагчыма.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18.07.2011г. №300-З “Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб” адказ на зварот можа быць абскарджаны ў вышэйстаячую арганізацыю: Гомельскі аблвыканкам.

Намеснік старшыні Д.У. Мілер

Дзешын